Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

***Па вёсках нашага краю***

# Летапіс родная старонкі

***да 500-годдзя з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна***

Кобрын
2019

ББК 91.9:26.89 (4Беі)
Л52

***Укладальнікі:***

*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

*Т. М. Баранская* – бібліятэкар І катэгорыі Імянінскай публічнай інтэграванай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***

*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**Летапіс роднай старонкі** : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 500-годдзя з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад. : С. Д. Курачук,
Т. М. Баранская. – Кобрын, 2019. – 40 с : каляр. фота. - (Па вёсках нашага краю).

# ПРАДМОВА

«Летапіс роднай старонкі» - чацвёртае выданне з цыкла бібліяграфічных паказальнікаў пад агульнай назвай «Па вёсках нашага краю».

Першае выданне «Сузор’е кобрынскіх вёсак» было прысвечана 450-годдзю першага ўпамінання шматлікіх вёсак Кобрыншчыны на старонках гісторыі, першакрыніцай якіх з’явілася «Рэвізія Кобрынскай эканоміі, складзеная ў 1563 г. каралеўскім рэвізорам Дзмітрыем Сапегам».

Другое выданне - інфармацыйна-пазнавальны даведнік «Скрозь памяць стагоддзяў» - прысвечана 500-гадоваму юбілею вёсак Балоты, Стрыгава Кобрынскага раёна, які адзначаўся ў 2013 годзе.

Гісторыка-краязнаўчы нарыс «Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні» выдадзены да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін.

Любоў да родных мясцін жыве ў душы кожнага чалавека. Нарыс «Летапіс роднай старонкі» выдаецца ў Год малой радзімы ў Беларусі і прысвечаны юбілейнай даце - 500-годдзю з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна. Выданне прызначана шырокаму колу карыстальнікаў, заклікана абудзіць пачуццё дачынення да гісторыі і сённяшняга дня сваёй малой радзімы.




**Імянін** - вёска ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь. Адносіцца да Буховіцкага сельскага савета Кобрынскага раёна. За 8 км на поўнач ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын, 55 км ад Брэста. Каля аўтадарогі Кобрын – Высокае.



***Крыж – абярог вёскі***




Кожны, нават самы непрыкметны куточак нашай Бацькаўшчыны, мае сваю асаблівую і захапляльную гісторыю. Так і вёска Кобрынскага раёна пад назвай Імянін…

У *XVI ст.* землі маёнтка Імянін Кобрынскага павета ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Першы ўспамін пра Імянін датуецца *1519* годам. Менавіта ў гэтым годзе вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Жыгімонт І Стары сваёй граматай пацвердзіў правы баярына кобрынскага Некраша Сямёнавіча Качаноўскага на вечнае ўладанне 2 часткамі маёнтка Імянін і с. Байкавічы (знаходзілася каля Імянін). Адпаведна з граматай уладар маёнтка атрымаў землі за службу яшчэ ад князя Івана Сямёнавіча Кобрынскага каля 1459 года.

Праз сорак гадоў, у 1559 годзе, маёнтак ва ўладанні пана Льва Некрашэвіча і чатырох братоў Ждановічаў.

У 1563 г. Імянін – маёнтак і сяло каля Кобрына ў Брэсцкім ваяводстве, у 1589 г. – уладанне Т. Л. Заранка, пазней – Кобрынскага манастыра, у 1693 г. – маёнтак.

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) - у складзе Расійскай імперыі, у Кобрынскім павеце, з 1801 года ў Гродзенскай губерніі.

У 1845 г. маёнтак Імянін і в. Востраў - уладанне Фелікса і Віктара Пуслоўскіх, 2644 дзесяцін зямлі. У склад маёнтка ўваходзілі вёска і фальварак Імянін (40 двароў, 305 рэвізскіх душ, 6 дваровых сялян), в. Востраў (25 двароў, 192 рэвізскія душы).

У 1864 г. адкрыта народнае вучылішча.




З 1877 года маёнтак стаў уласнасцю Севярына Навамейскага і складаў 951 дзесяціну зямлі. У маёнтку

быў закладзены парк: мноства кустоў бэзу, бярозавы гай, велізарная ліпавая алея, а наўкол раслі магутныя дубы.

Цэнтрам кампазіцыі быў сядзібны дом, пабудаваны з дрэва, аднапавярховы, па цэнтры мансардны, вылучаны невялікім ганкам на драўляных слупах (застаўся фотаздымак на нямецкай паштоўцы 1915 года «Сядзібны дом Севярына Навамейскага»). Сядзіба з’яўлялася радавым гняздом Навамейскіх.



Пасля смерці Севярына Навамейскага землі маёнтка былі падзелены паміж яго жонкай Марыяй, сынам Феліксам і дачкой Евай. Сам маёнтак адышоў яго адзінаму сыну Феліксу. На землях заможнага пана былі пабудаваны два двухпавярховыя будынкі з чырвонай цэглы. У пасляваенны час у маёнтку размяшчалася вайсковая часць. Захаваўся колішні мураваны будынак кашары.



У *1890* г. вёска ў Стрыгаўскай воласці, 737 дзесяцін зямлі.

У *1897* г. вёска – 73 двары, 483 жыхары, хлебазапасны магазін; 2 дамы для рабочых (Імянін), 63 і 7 жыхароў; 3 маёнткі, уладанні Валянціны, Адольфа і нашчадкаў Ільі Стэфаноўскіх: адпаведна 21, 1, 2 жыхары.

У *1905* г. вёска (621 жыхар) і маёнтак (97 жыхароў).

У *1911* г. Імянін – вёска, 278 жыхароў; хутар, 319 жыхароў; два аднайменныя маёнткі, уладанні Севярына Стэфаноўскага і Фелікса Навамейскага, 165 жыхароў.

З *1921* г. у складзе Польшчы, у Стрыгаўскай гміне Кобрынскага павета Палескага ваяводства; вёска – 74 двары, 469 жыхароў; фальварак – 5 двароў, 118 жыхароў. У *1930*-я гады працавалі школа і чытальня.

З *1939* года - у складзе БССР, з *15.01.1940* г. - у Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці, з *12.10.1940* г. - у Лепясоўскім, з *30.10.1959* г. - у Яроміцкім, з *19.07.1976* г. – у Буховіцкім сельсаветах.

У *1940* г. у хутары Імянін налічвалі 145 двароў, 760 жыхароў; былы маёнтак – 3 двары, 8 жыхароў.

У часы Вялікай Айчыннай вайны Імянін акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі з чэрвеня *1941* г. да ліпеня *1944* г.

У *1946* г. працавала 7-гадовая школа.

У *1950* г. на землях вёскі Імяніны створаны калгас пад назвай «Краіна Саветаў», у якім аб’ядналася 70 гаспадарак, арганізаваны дзве брыгады (140 калгаснікаў). Паспяхова развівалася раслінаводства і жывёлагадоўля. Дзейнічалі кузня і млын. З 1952 па 1963 гг. калгасам кіраваў Іван Ніканавіч Дзенісюк. Некалькі разоў праходзіла аб’яднанне калгасаў, у выніку ў вёсцы быў створаны адзіны калгас імя Жданава. Потым калгас ператвораны ў саўгас. Першым дырэктарам саўгаса назначаны Мікалай Тарасавіч Свірыдзюк.




Паводле перапісу *1959* г. у вёсцы 704 жыхары, у *1970* г. – 648 жыхароў.

У *1999* г. - 270 гаспадарак, 706 жыхароў, цэнтр калгаса «Кобрынскі».

У *1999* годзе калгас ператорваны ў адкрытае акцыянернае таварыства «Агра-Кобрынскае».




Кіраўніком ААТ стаў Сяргей Дзмітрыевіч Селівестраў, які кіруе таварыствам па сённяшні дзень.






Гаспадарка займае перадавыя пазіцыі па розных паказчыках: тут вырошчваюць збожжавыя культуры, развіта жывёлагадоўля, малочная прамысловасць.

Але асноўны напрамак дзейнасці таварыства – вырошчванне агародніны. Не толькі летам, але і ў любую пару года ў «Агра-Кобрынскім» можна набыць свежую капусту, сталовыя буракі, моркву і бульбу. Тут дзейнічае дабротнае сучаснае сховішча для гародніны, дзе падтрымліваецца неабходны тэмпературны рэжым і



створаны іншыя ўмовы для захавання прадукцыі. Агародніна карыстаецца попытам у сацыяльных установах Кобрына, пастаўляецца не толькі ў гандлёвыя сеткі Брэсцкай вобласці, Беларусі, але і ў іншыя краіны.



ААТ «Агра-Кобрынскае» стабільна трымаецца сярод лідараў Брэстчыны па ўраджайнасці збожжавых культур на працягу доўгага часу.

У гаспадарцы пабудаваны збожжа-сушыльны комплекс. Нават суседнія калгасы прывозяць сюды збожжа на апрацоўку. За сродкі гаспадаркі абнаўляецца аўтамабільны парк.





Але, несумненна, самай вялікай каштоўнасцю вёсцы, гаспадаркі з’яўляюцца людзі, якія старанна і добрасумленна працуюць на зямлі. Кніга працоўнай славы і дошка гонару красамоўна адлюстроўваюць гэта.



За сумленную працу лепшых рабочых і служачых узнагароджваюць граматамі, пуцёўкамі ў санаторый, прэміямі. Неаднаразова пераможцамі жніва станавіліся Сяргей Жолах, Сцяпан Кубай.

Сярод узнагароджаных – галоўны аграном ААТ «Агра-Кобрынскае» Іван Гусак. За рэкордныя працоўныя дасягненні ён двойчы ўдзельнічаў у рэспубліканскіх фэстываляхкірмашах «Дажынкі» (2007, 2010 гг.). У 2007 годзе на рэспубліканскіх Дажынках ён прызнаны лепшым аграномам рэспублікі. Неаднаразова І. Гусак лічыўся лепшым аграномам Кобрынскага раёна і Брэсцкай вобласці. Прымаў удзел у рабоце V Усебеларускага народнага сходу (2016).



У *2005* г. у в. Імянін 268 гаспадарак, 708 жыхароў; у *2009* г. - 696 жыхароў.

На *2012* год плошча населенага пункта складае 2 390 000 м$^2$ (239 га).

Па дадзеных на *1 студзеня 201*8 г. насельніцтва Імянін склала 703 жыхары ў 264 гаспадарках.

У 1974 г. на доме, у якім да пачатку Вялікай Айчыннай вайны жыў *Барыс Мікалаевіч Сурын,* камандзір 123-га авіяцыйнага знішчальнага палка, установлена мемарыяльная дошка.



Барыс Мікалаевіч Сурын нарадзіўся 2 жніўня 1907 г. у Ленінградзе, у сям'і служачых. У 1926 г. быў накіраваны на вучобу ў артылерыйскую школу, у 1928 г. пачаў служыць у Чырвонай Арміі, затым вучыўся ў ваеннай школе лётчыкаў, у 1938 г. яго назначылі камандзірам эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. У 1940 г. Б. М. Сурын - камандзір 123-га знішчальнага авіяпалка.



22 чэрвеня 1941 г., каля дзвюх гадзін ночы, камандзір палка падняў увесь састаў па баявой трывозе. У першы дзень вайны лётчыкі палка на працягу дзесяці гадзін вялі бесперапынны паветраны бой і збілі 30 варожых самалётаў, страціўшы пры гэтым дзевяць сваіх. Барыс Сурын у гэты дзень правёў чатыры паветраныя баі, збіў тры самалёты ворага, але сам атрымаў смяротнае раненне.

Яго пахавалі непадалёку ад Кобрына. Першы камандзір 123-га авіяпалка назаўсёды застаўся на кобрынскай зямлі.




Удзячныя жыхары Кобрына па рашэнні выканкама раённага Савета дэпутатаў працоўных 17 чэрвеня 1964 года назвалі вуліцу яго імем.

У в. Імянін нарадзіўся *Уладзіслаў Паўлавіч Падпалаў*, беларускі вучоны ў вобласці клінічнай медыцыны, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя, доктар медыцынскіх навук, прафесар.



У. П. Падпалаў - аўтар болей за 350 навуковых і навукова-метадычных прац. Член экспертнай камісіі Навуковага медыцынскага Савета Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, член рэдакцыйных саветаў двух замежных і трох айчынных часопісаў. Кіруе фундаментальнымі і прыкладнымі навуковымі даследаваннямі ў вобласці аховы здароўя, дэмаграфіі, прафілактычнай медыцыны і кардыялогіі.

*Анатолій Васільевіч Бельскі* нарадзіўся 6 лістапада 1957 года ў в. Імянін. Закончыў школу ў 1974 годзе, паступіў у Житомірскае вышэйшае вучылішча радыёэлектронікі. З 2003 года займае муніцыпальныя пасады старшыні Раённага сходу, Кіраўніка муніцыпальнага ўтварэння «Бароўскі раён» (Расія). Узнагароджаны медалём «За особые заслуги перед Калужской областью III степени». Дэпутат Раённага Сходу муніцыпальнага ўтварэння «Бароўскі раён» I, II і III скліканняў, член Усерасійскай палітычнай партыі «Единая Россия».






Не толькі жыхары Кобрыншчыны ведаюць пра дзіцячы аздараўленчы цэнтр «Жемчужинка» саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў, які існуе з 1992 г. у вёсцы на тэрыторыі ў 40 гектараў былой панскай сядзібы.





Тут створаны спрыяльныя ўмовы для адпачынку і аздараўлення дзяцей і пажылых людзей. На працягу ўсяго лета арганізаваны цікавыя праграмы для дзяцей усіх узростаў – ад малодшых школьнікаў да моладзі.

Цэнтр мае спальныя карпусы для дзяцей і дамы для пражывання супрацоўнікаў, сталовую і пякарню, паліклініку для медыцынскага абслугоўвання, сад і агарод.







*26 чэрвеня 2012* г. адбылося адкрыццё Дома міласэрнасці для састарэлых.



Дом міласэрнасці з'яўляецца сацыяльнай недзяржаўнай установай (прыватны дом-інтэрнат для састарэлых і людзей з інваліднасцю). Прызначаны для



часовага пражывання састарэлых і людзей з абмежаванымі магчымасцямі, якія маюць патрэбу ў асаблівай апецы, пабочным доглядзе і бытавым абслугоўванні.



Нягледзячы на сталы ўзрост, Імянін не старэе. У вёсцы працуе шмат моладзі, створаны камфортныя ўмовы для жыцця і працы. Праводзіцца рамонт дарог, добраўпарадкаванне тэрыторыі вёскі.








Ёсць у вёсцы яслі-сад, дзе дзейнічае тры групы. Дзеці маюць магчымасць атрымліваць музычную адукацыю ў Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў.









Імянінская сярэдняя школа ў 2004 годзе адсвяткавала свой стогадовы юбілей. Школа была царкоўна-прыходскай. Усе вучні знаходзіліся ў адным памяшканні, навучанне вялося на польскай мове. Захаваўся адзін з будынкаў старой школы, у якім знаходзіцца школьная майстэрня – кабінет працы для хлопчыкаў.

На сённяшні дзень школа мае сучасны прыгожы выгляд. Ёсць камп'ютарны клас, добрая спартыўная зала, стадыён.





Амаль кожны год школа мае сваіх медалістаў. На раённых алімпіядах вучні Імянінскай школы займаюць першыя месцы.

Існуе школьны краязнаўчы музей «Імянінaчка». З усіх куткоў вёскі былі сабраны эспанаты для экспазіцыі: прылады працы, прыстасаванні, вялікая калекцыя ручнікоў. Музей прадстаўляе сабой выяву старажытнай вясковай хаты. Наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з тым, як жылі і працавалі нашы дзяды і прадзеды.









Не кожная вёска можа пахваліцца выдатным медыцынскім абслугоўваннем. Жыхарам в. Імянін пашанцавала. Амбулаторыя ўрача агульнай практыкі – добры падарунак насельніцтву ў плане атрымання неабходнай медыцынскай дапамогі.



У будынку амбулаторыі ёсць зубны і працэдурныя кабінеты, працуе аптэка.








Неабавязкова жыхарам вёскі Імянін ехаць у Кобрын, каб заплаціць камунальныя паслугі, паслугі сувязі, атрымаць газеты і часопісы. Усё гэта можна здзейсніць на мясцовай пошце.



У вёсцы ёсць магазін «Смак», баня.






Пасля доўгага працоўнага дня жыхары вёскі могуць пайсці ў бібліятэку.



Імянінскую публічную інтэграваную бібліятэку штогод наведвае 500 чытачоў. Фонд бібліятэкі - амаль 8 тысяч экзэмпляраў. Бібліятэка атрымлівае цікавыя часопісы і газеты. За апошнія гады паступіла шмат новай мастацкай, дзіцячай, галіновай літаратуры, элект-ронных выданняў; набыта камп'ютарнае абсталяванне. З задавальненнем прыходзяць у бібліятэку і дзеці, і дарослыя.



# У час святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 495-годдзю в. Імянін








# КРАЯВІДЫ













# СПІС КРЫНІЦ

**Жучкевич, В. А.** Именины // Краткий топонимический словарь Белоруссии / В. А. Жучкевич. – Минск, 1974. – С. 146.

**Именин**, Буховичский сельсовет. Дом, в котором жил Сурин // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. - Минск, 1990. - С. 257.

**Імянін** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Т. 4. кн. 2. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 2007. - С. 150.

**Імянін**, Буховіцкі сельсавет. Мемарыяльная дошка Сурыну // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. - С. 233.

**Імянін** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 583-584.

**Імянін** – 500 гадоў з часу першага ўпамінання (1519) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016-2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2018. – С. 89.

**Імянін.** Мемарыяльная дошка Сурыну Б. М. // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 162-163 : фота.

**Імянін.** Сядзіба Навумінскіх // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 181-182 : фота.

**Імяніны** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 5. – С. 77.

**Назвы** населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць : нарматыўны даведнік / І. А. Гапоненка і інш.; пад рэд. В. П. Лемцюговай. — Мінск, 2010.— 318 с.

Гл. на с. 183.

**Несцярчук, Л. М.** Імянін / Л. М. Несцярчук // Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX ст. (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск, 2002. – С. 195.

Колішні маёнтак – радавое гняздо Навумінскіх.

**Об установлении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов : 30 июня 2012 г, № 124 : в ред. Закона Респ. Беларусь от 27 дек. 2012 г., № 144 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

**Падпалаў** Уладзіслаў Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2000. - Т. 11. - С. 504.

**Падпалаў** Уладзіслаў Паўлавіч // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. - С. 104-106.

**Подпалов** Владислав Павлович // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 245-246.

**Подпалов** Владислав Павлович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. - Минск, 2008. - Т. 6. - С. 129.

**Федорук, А. Т.** Усадьбы времен эклектики. Именин / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск, 2004. – С. 292, 502-503.

**Харузин, А.** Крестьянская хата в селе Именин / А. Харузин // Славянское жилище в Северо-Западном крае : из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Харузин. – Вильна, 1907.

**Бакун, А.** Усё пачынаецца з кахання / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. - 16 сакавіка. - С. 1, 2.

Сям'я Якаўлевых з в. Імянін — пераможца конкурсу «Шматдзетная сям'я года».

**Бялоў, Д**. Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў – 30 гадоў / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2019. - 15 мая. – С. 5.

**Елизарова, Ж.** Когда в семье живёт любовь / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2019. – 1 чэрвеня.- С. 1, 4.

В многодетной семье Яковлевых из Именин царит особый уклад.

**Пальто, К.** На крыльях фантазии / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. - 19 мая. - С. 12.

Воспитанники объединения по интересам Именинской СШ — активные участники районных и областных творческих конкурсов.

**Бакун, А.** Тут здзясняюцца мары / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 28 чэрвеня. - С. 5.

У 2016-2017 навучальным годзе ў Імянінскай дзіцячай школе мастацтваў - 100 навучэнцаў.

**Казакова, А.** Отдых в «Жемчужинке» / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. - 13 июля. - С. 4.

Ежегодно детский оздоровительный центр «Жемчужинка» принимает на отдых детей-инвалидов и их матерей.

**Казакова, А**. Отдых с пользой для души / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. - 22 июня. - С. 2.

В ГУО «Именинская средняя школа» организован для учащихся палаточный лагерь с круглосуточным пребыванием.

**Пашкович, Л.** Прикосновение к живой природе / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. - 11 лістапада. - С. 3.

Учащиеся Именинской СШ на каникулах посетили Кобринский эколого-биологический центр.

**Юшкевич, П.** Технологии стабильных рекордов / Павел Юшкевич // Сельская газета. - 2017. - 16 ноября. - С. 16.

ОАО «Агро-Кобринское» — небольшое предприятие, где работают около 150 человек.

**Дубіна, Л.** 165 гадоў працы на ўсіх / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. - 3 жніўня. - С. 1.

У межах святкавання Дня горада сям`я Нікіцюк з ААТ «Кобрынскае» адзначана дыпломам райвыканкама, як сямейная дынастыя з 165-ю гадамі агульнага працоўнага стажу.

**Дубіна, Л.** Праляцелі гады, як адно імгненне / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. - 5 лістапада. - С. 4.

Сямейная пара Марыі і Мікалая Конюх з в. Лягаты шмат гадоў разам працавалі ў аддзяленні паштовай сувязі «Імянін».

**Марчук, Н.** История Чёрной Мадонны, или возврату… подлежит! / Нина Марчук // Кобрынскі веснік. – 2016. – 20 октября. – С. 5.

История имений Стригово, д. Именин.

**Сенчук, В.** «Время праздничных итогов и новых ориентиров» / Владимир Сенчук ; [беседовал] Александр Курец // Сельская газета. - 2016. - 3 сентября. - С. 8.

Лидером среди хозяйств Брестской области по урожайности зерновых является ОАО «Агро-Кобринское».

**Субат, У.** У полі мой працоўны кабінет / Уладзімір Субат // Сельская газета. - 2016. - 19 ноября. - С. 24, 25.

Размова з галоўным аграномам «Агра-Кобрынскае» І. Гусакам.

**Сытин, А.** С пользой для тела и души / Александр Сытин // Кобрынскі веснік. - 2016. - 25 чэрвеня. - С. 9.

Для учащейся молодежи Именинской средней школы работал православный палаточный лагерь.

**Тимошук, А**. Добро, подаренное детям / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. - 20 красавіка. - С. 2.

80-летний юбилей отпраздновал П. Дащук, бывший директор Именинской средней школы.

**Ярмошук, Н.** Чем наполним закрома? / Николай Ярмошук // Заря. - 2016. - 3 сентября. - С. 4.

ОАО «Агро-Кобринское» является лидером в Брестской области по урожайности зерновых.

**Бялоў, Д.** Высокая планка «Агра-Кобрынскага» / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2015. - 23 верасня. - С. 1, 2.

ААТ «Агра-Кобрынскае» лепшае ў раёне па ўраджайнасці збожжа.

**Казакова, А.** Чтобы дети не остались без отдыха / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. - 10 сентября. - С. 5.

Оздоровление детей с ограниченными возможностями в Кобринском районе.

**Федаровіч, І.** Прывычка жыць на зямлі / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2015. - 25 лютага. – С. 1.

Аб адным з лепшых механізатараў ААТ «Агра-Кобрынскае» С. Жолаху.

**Шпендик, А.** Связистом быть не просто / Андрей Шпендик // Кобрынскі веснік. - 2015. - 21 лістапада. - С. 4.

Об И. Кравчуке - начальнике радиостанции командного пункта 115-го зенитного ракетного полка, уроженце д. Именины.

**Лесік, І.** Усё атрымалася! / Ірына Лесік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. - 6 верасня. – С. 1, 2.

Сёлета ААТ «Агра-Кобрынскае» - першае ў вобласці па ўраджайнасці збожжавых каласавых культур.

**Мельнік, Р.** «Лічбу 13 не лічу нешчаслівай» / Раман Мельнік ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. - 1 студзеня. - С. 2.

ААТ «Агра-Кобрынскае» ўвайшло ў тройку лідараў у вобласці па ўраджайнасці збожжавых (галоўны аграном - Іван Гусак).

**Пьедестал** почёта // Сельская газета. - 2014. - 16 августа. - С. 6.

В числе лучших сельхозпредприятий с наивысшей урожайностью - ОАО «Агро-Кобринское».

«**Агоро-Кобринское**» среди победителей : Дожинки-2013 // Кобрынскі веснік. - 2013. - 5 кастрычніка. - С. 1.

Победителем республиканского смотра-конкурса «Землепользование высокой культуры земледелия, благоустройство машинных дворов, животноводческих ферм и комплексов» в 2013 г. признано ОАО «Агро-Кобринское».

**Казакова, А.** Это лето жемчужного цвета / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. - 8 августа. - С. 26.

Группа детей-инвалидов Кобринщины проходила оздоровление в детском оздоровительном центре «Жемчужинка», находящемся в д. Именин.

**Каменкова, М.** Вклад в социальную жизнь общества: праведные места и праведные люди / Марина Каменкова // Брестский курьер. - 2013. - 22 августа. - С. 12,13.

О детском оздоровительном центре «Жемчужинка» возле д. Именины.

**Козлович, В.** Надо успеть / Валентина Козлович // Кобрынскі веснік. - 2013. - 21 жніўня. - С. 1,2.

О детском оздоровительном центре «Жемчужинка» возле д. Именины.

**Пянко, А.** Религиозные конфессии и социальное служение / Алексей Пянко ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2013. - 21 жніўня. - С. 1,2.

Участники журналистского пресс-тура познакомились с жизнью детского оздоровительного центра «Жемчужинка» у д. Именины.

**Сацук, А.** Мечты становятся реальностью / А. Сацук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 15 студзеня. - С. 2.

ОАО «Агро-Кобринское».

**Овощи** для северной столицы // Заря. - 2009. - 16 апреля. - С. 7.

ОАО «Агро-Кобринское» организовало поставки овощей продукции в Санкт-Петербург.

**Пилипчук, П.** Директорская осень Сергея Селивестрова / П. Пилипчук // Заря. - 2009. - 15 октября. - С. 6.

**Сацук, А.** Свежие овощи круглый год / Алексей Сацук // Кобрынскі веснік. - 2009. - 13 мая. - С. 3.

**Лосич, П**. Удача - дама капризная / Павел Лосич // Заря. - 2007. - 9 августа. - С. 1-2.

ОАО «Агро-Кобринское» в списке самых урожайных хозяйств Брестчины.

**Овощеводство** – дело прибыльное // Кобрынскі веснік. – 2005. – 14 декабря.

**Старая** мельница… : [фото мельницы в д. Именин] // Заря. – 2004. – 21 октября. – С. 2.

**Пятроўская, М.** Юбілей школы / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1994. – 16 лістапада. – С. 3.

90-годдзе адзначыла Імянінская сярэдняя школа.

**Новое** имя на карте // Сельская газета. – 1990. – 14 января.

Совхоз имени Жданова переименован в совхоз «Кобринский».

**Хоміч, В.** Ёсць над чым падумаць / В. Хоміч // Камуністычная праца. – 1978. – 9 лютага.

Працоўнае навучанне ў Імянінскай 8-мі гадовай школе.

*Па вёсках нашага краю*

# Летапіс
# роднай старонкі

**гісторыка-краязнаўчы нарыс**
**да 500-годдзя з часу першага ўпамінання**
**в. Імянін Кобрынскага раёна**

Укладальнікі:
С. Д. Курачук,
*гал. бібліёграф цэнтральнай*
*раённай бібліятэкі,*
Т. М. Баранская,
*бібліятэкар I катэгорыі Імянінскай*
*публічнай інтэграванай бібліятэкі*

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
E-mail: kobrinlib@gmail.com